УДК 34 (476) (091)

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАВАВОЙ КУЛЬТУРЫ Ў СТАРАЖЫТНЫМ БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСТВЕ

**Т. І. Доўнар**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права,
прафесар
e-mail: dovnar-taisa@rambler.ru

***Анатацыя.*** *Разглядаюцца пытанні станаўлення прававой культуры ў старажытных беларускіх дзяржавах, значэнне юрыспрудэнцыі ў яе фарміраванні, уклад беларускіх мысліцелей у развіццё прававых ідэй і іх увасабленне ў заканадаўстве. Адзначаны ўплыў законаў Вялікага Княства Літоўскага, асабліва Статута 1588 года, на павышэнне ўзроўню прававой культуры.*

***Ключавыя словы:*** *гісторыя права, прававая культура, палітыка-прававая думка, заканадаўства ВКЛ, Статут 1588 года.*

***Annotation.*** *The article deals with the formation of legal culture in the ancient Belarusian states, the importance of jurisprudence in its formation, the contribution of Belarusian thinkers to the development of legal ideas and their implementation in legislation. The influence of the laws of the Grand Duchy of Lithuania, especially the Statute of 1588, on raising the level of legal culture is noted.*

***Keywords:*** *history of law, legal culture, political and legal thought, legislation of the Grand Duchy of Lithuania, Statute of 1588.*

Прававая культура ўяўляе сабой адзін з відаў культуры, адносна якой у розных навуках існуе шмат вызначэнняў. Таксама і ў юрыдычнай літаратуры навукоўцы па-рознаму даюць вызначэнне прававой культуры і яе структурным часткам, аднак пры гэтым лічаць, што менавіта прававая культура — гэта «квинтэссенция всех разновидных культур, поскольку ни одна из них не может противоречить праву как регулятору верховенствующему, обязательному, универсальному» [1, с. 276]. Навукоўцы падкрэсліваюць, што пры дапамозе права ў жыцці грамадства «вносятся высокоцивилизационные начала, осуществляется правовое “окультуривание” всей системы общественных отношений» [2, с. 75].

У фарміраванне прававой культуры чалавечага грамадства перш за ўсё ўнесла ўклад юрыспрудэнцыя, якая як навука, г. зн. сістэма дакладных ведаў аб праве (як пазнанне боскіх і чалавечых спраў, справядлівага і несправядлівага), узнікла ў старажытным Рыме. Адзначым, што з юрыспрудэнцыяй звязана і развіццё культуры пісьмовага слова. Старажытныя помнікі пісьмовасці — гэта перш за ўсё заканадаўчыя прававыя дакументы, прычым для свайго часу з добра распрацаваным стылем, з даволі дасканалай формай выкладання, у што ўнеслі ўклад многія тагачасныя мысліцелі, асветнікі, дзяржаўныя службоўцы.

У цэнтры ўвагі навукоўцаў розных гістарычных эпох былі шматлікія тэарэтыка-прававыя праблемы, звязаныя з асаблівасцямі дзяржавы, права, прававых прынцыпаў, прававой культуры. Адпаведна гістарычным перыядам характэрнымі былі розныя суадносіны права і дзяржавы ў грамадскім жыцці, а тым самым — розная ступень увагі навукоўцаў да праблем, якія яны развівалі ў палітыка-прававых дактрынах, а таксама розныя шляхі пошуку іх вырашэння. Гістарычнае развіццё прававых ідэй сведчыць аб складаным і працяглым працэсе спасціжэння сутнасці і прызначэння права мысліцелямі папярэдніх эпох і стагоддзяў, якія ў якасці прававых ідэй сутнаснай падставы права выкарыстоўвалі разнастайныя каштоўнасці цывілізаванага грамадства: справядлівасць, свабоду, агульную волю, юрыдычна абаронены інтарэс і інш. Таксама нашыя продкі, якія ўжо ў далёкай старажытнасці мелі ўласную дзяржаўнасць і жылі ў адпаведнасці з уласнымі звычаямі, рэлігіяй і мараллю, разважалі пра дзяржаву, яе палітыка-прававыя інстытуты, перш за ўсё маючы на ўвазе паляпшэнне ўзаемаадносін паміж людзьмі, у тым ліку шляхам стварэння належных пісаных законаў і прававых прынцыпаў.

Характэрнай рысай тагачаснага права старажытных беларускіх дзяржаў была ідэя роўнасці ўсіх вольных людзей, якія валодалі аднолькавай прававдольнасцю і ўдзельнічалі ў вырашэнні дзяржаўных спраў на вечавых сходах. Як сведчаць гістарычныя звесткі, жыхары старажытных беларускіх дзяржаў вельмі паважалі свабоду і асабліва зберагалі такі найважнейшы аспект свабоды, як выбранне ўласнага князя і афармленне належнага дагавору з ім, што ўяўлялася ім гарантам не толькі моцнай дзяржавы, але і свабоды жыхароў. Так, у дайшоўшых да нашага часу дагаворах Полацкага княства мы знаходзім нормы аб выбранні ўсім насельніцтвам полацкага ваяводы (раней — князя). Прычым удакладнялася, што калі ён не спадабаецца палачанам, то патрэбна іншага «дати по их воли» [3, с. 107].

У гэтых дагаворах утрымліваўся шэраг нормаў аб правах і свабодах жыхароў, у тым ліку аб свабодзе тэрытарыяльнага перамяшчэння. Так, у Полацкай грамаце гаварылася: «Теж полочаном всим жити в Полоцку добровольно, покуль хто хочетъ» [3, с. 107]. Таксама са старажытнага звычаёвага права ў пісанае заканадаўства перайшлі нормы, якія сведчылі аб імкненні жыхароў беларускіх княстваў мірна суіснаваць з іншымі народамі. Так, у многіх дагаворах паўтаралася: «иж бы мир тверд был», «иж бы мир не раздрушен был» [3, с. 11, 16].

Неабходна адзначыць, што Полацкае княства з X ст. уяўляла сабой адну з найбуйнейшых дзяржаў у Еўропе, а горад Полацк быў тым важным палітычным і культурным цэнтрам, дзе перакрыжоўваліся шляхі многіх народаў. Дакументы сведчаць, што палачане карысталіся не толькі звычаямі,

але і пісаным заканадаўствам, ведалі мовы іншых народаў (у першую чаргу лацінскую), а полацкія майстры здзіўлялі замежных гасцей сваімі рамеснымі вырабамі — прадметамі ганчарства, шавецтва, ювелірнага майстэрства і інш. Высокі ўзровень культуры і дэмакратызм улады (добра вядома аб функцыянаванні полацкага веча) садзейнічалі духоўнаму росквіту насельніцтва.

Таксама са старажытных часоў у Беларусі развівалася грамадска-палітычная і прававая думка — складаная частка прававой культуры грамадства. У той час яна перш за ўсё была цесна звязана з жыццём чалавека, яго працай і барацьбой за існаванне. Для беларускай мінуўшчыны характэрна даволі значная колькасць славутых гістарычных постацяў — дзяржаўных дзеячаў, асветнікаў і мысліцеляў, аднак дакладныя звесткі толькі пра некаторых з іх дайшлі да нашага часу. Так, зоркай першай велічыні ззяе з глыбінь стагоддзяў імя Еўфрасінні Полацкай [4, с. 1–2]. Нам добра вядома пра яе падзвіжніцтва ў сферы ўмацавання хрысціянскага веравызнання, яе шырокую асветніцкую дзейнасць, што значна ўплывала на грамадска-палітычнае жыццё Полацкай дзяржавы. Навукоўцы адзначаюць, што можна даволі дакладна сцвярджаць, што Еўфрасіння Полацкая была знаёма з вучэннямі Сакрата, Платона, Арыстоцеля і іншых старжытных мысліцеляў, а таксама з творамі знакамітага візантыйскага святара і прапаведніка Іаана Златавуста, бо разважала аб прыродзе і сутнасці свецкай і боскай улады, аб градзе зямным і градзе нябесным і г. д. [5, с. 12]. Перш за ўсё яе ўвагу прыцягвалі кнігі, у якіх былі адлюстраваны погляды на сутнасць чалавечага жыцця, на адносіны паміж людзьмі і прычыны барацьбы сіл дабра і зла. Еўфрасіння Полацкая была актыўным прапагандыстам і абаронцам міру. Увогуле ўсім сваім складам жыцця, шматграннай дзейнасцю яна паказвала на неабходнасць павагі да роднай зямлі, яе культуры і патрэбу ў павышэнні самасвядомасці народа [4, с. 2].

Як бачна ў абласных граматах XV–XVI стст., правы і свабоды жыхароў беларускіх княстваў доўга захоўваліся і пасля ўваходжання гэтых зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага. Так, шэраг з іх утрымлівалі нормы аб свабодным выбранні сваіх галоўных кіраўнікоў, аб праве мець уласную Царкву і маёмасць, свабодна выязджаць за межы дзяржавы і інш. Напрыклад, у грамаце, якая была дадзена вялікім князем Віцебскай зямлі ў 1503 г., гаварылася: «Витбляном жити у Витебску доброволно… покуль хто всхочеть… а будет ему нелюбо: нам его силою не держати, ино ему путь чист, куды хочет, безо всякое зачепки» [3, с. 97]. Жыхары гэтых зямель захоўвалі права на ўласнае кіраванне і суды. Так, у грамаце Полацкай зямлі 1511 г. ад імя вялікага князя гаварылася: «А казнить полочаном по своему праву, а в то ся нам не вступатися» [3, с. 106]. У цэлым гэтыя законы ўтрымлівалі вельмі прагрэсіўныя для свайго часу пра-

вавыя ідэі і палажэнні, якія потым увайшлі ў агульнадзяржаўнае заканадаўства Вялікага Княства Літоўскага — буйной феадальнай дзяржавы, палітыка-эканамічным цэнтрам якой і сталі землі старажытных беларускіх княстваў.

Менавіта ў перыяд станаўлення ВКЛ узнікае патрэба ў тэарэтычным асэнсаванні новых палітычных і грамадскіх працэсаў. Як сведчаць дакументальныя крыніцы, праблема далейшага развіцця дзяржавы, правоў людзей пачала абмяркоўвацца з моманту стварэння дзяржавы, аднак асабліва актыўна — у другой палове XVI стагоддзя, калі пачалося рэфармаванне ўсіх грамадскіх адносін. Гэтаму садзейнічала актыўнае развіцце адукацыі і кнігадрукавання, а таксама з'яўленне падчас судовай рэформы прафесійных юрыстаў (суддзяў, адвакатаў і інш.), што значна ўплывала на правасвядомасць насельніцтва.

У XVI ст. выразна праяўляецца тэндэнцыя фарміравання кола беларускіх мысліцеляў, асветнікаў і палітычных дзеячаў (Францыск Скарына, Міхалан Літвін, Сымон Будны, Андрэй Волан, Мікалай Радзівіл Чорны, Астафій Валовіч, Леў Сапега і інш.), якія пры даследаванні праблем дзяржаўна-прававога развіцця абгрунтоўваюць самыя прагрэсіўныя для свайго часу прававыя ідэі і прынцыпы. Асобнае месца сярод іх займае тэарэтычная распрацоўка ідэй аб справядлівай дзяржаве, свабодзе і роўнасці людзей. Так, знакаміты мысліцель XVI ст. Францыск Скарына сцвярджаў, што права ў цэлым і асобныя законы павінны выдавацца на падставе звычаяў пэўнай зямлі, быць справядлівымі, прыстойнымі, карыснымі народу і накіраванымі на дасягненне агульнага дабра. Скарына лічыў, што права ствараецца народам са «сваімі старайшымі», чым фактычна падрываў тэорыю аб боскім паходжанні і нязменнасці права. Ён выказаў думкі аб народным суверэнітэце, ролі народа ў грамадскім развіцці і інш. [6, с. 358–359].

Многія айчынныя мысліцелі рабілі спробу вырашэння шэрага важных філасофскіх, прававых, этычных праблем з пазіцый рэнесанснага гуманізму і перш за ўсё — праблемы чалавека і грамадства. Аднак прыярытэт у пастаноўцы і гуманістычнай трактоўцы разнастайных аспектаў гэтай праблемы (духоўнага свету, прызначэння, годнасці, сэнсу жыцця, каштоўнасцей і ідэалаў, суадносін індывідуальнага і агульнага дабра, грамадскай актыўнасці, духоўна-маральнай свабоды, паходжання маральных уяўленняў, узаемасувязі духоўнага ўдасканалення чалавека з удасканаленнем грамадскіх інстытутаў і г. д.), як адзначае С. Падокшын, належыць Францыску Скарыне [7, с. 138].

Свецкай інтэрпрэтацыі палітыка-прававых інстытутаў садзейнічала пашырэнне на Беларусі рэфармацыйных, ренесансных і гуманістычных ідэй, што знайшло адлюстраванне ў навуковых працах А. Волана і А. Алізароўскага, Л. Зізанія, П. Скаргі, М. Сматрыцкага, В. Цяпінскага і іншых мысліцеляў. Так,

у трактаце А. Волана «Аб палітычнай або грамадзянскай свабодзе» гаворыцца аб імкненні да свабоды як важнейшай натуральнай уласцівасці чалавека і аб неабходнасці яе абараняць з дапамогай права, якое павінна ўтрымліваць тры важнейшыя элементы — справядлівасць, разумнасць і гарантаванасць свабоды і роўнасці людзей [6, с. 365–366]. Пры гэтым А. Волан падкрэсліваў, што «ніякае грамадства, ніякая грамадзянская супольнасць, ніякі мір і спакой паміж людзьмі не могуць існаваць без законаў…», а «справядлівасць у чалавечым грамадстве можа існаваць пры ўмове, што ў ім ёсць законы, створаныя на карысць грамадзян… і ўладатрымальнікі накіроўваюць гэтыя законы на паспалітае дабро» [8, с. 95–96]. Таксама ён зрабіў вельмі важны і апераджаючы свой час вывад: «дабрадзейства свабоды залежыць ад правільнага і ўпарадкаванага заканадаўства» [8, с. 96].

Гэтыя ідэі падтрымлівалі многія айчынныя мысліцелі, прычым некаторыя з іх (П. Гезка, М. Чаховіц, С. Будны, В. Цяпінскі і інш.) ужо непасрэдна займаліся праблемамі праваразумення і больш дасканалага прававога рэгулявання грамадскіх адносін. Патрэбна адзначыць, што многія замежныя філосафы і багасловы (Святы Аўгусцін, Фама Аквінскі і інш.) не ўяўлялі рэалізацыі пазітыўнага, дабрачыннага аспекту свабоды без царкоўнага пасрэдніцтва. Гуманісты ж рашуча выступілі супраць артадаксальна-хрысціянскай трактоўкі чалавечай свабоды. Таксама ў Вялікім Княстве Літоўскім разам з актывізацыяй рэфармацыйна-гуманістычнага руху адной з найбольш істотных ідэй, якая пачала абмяркоўвацца ў другой палове XVI ст., стала ідэя духоўна-маральнай свабоды чалавека. Пры гэтым для айчынных мысліцеляў характэрным стала імкненне змякчыць канцэпцыю абсалютнага наканавання, якая паводле Аўгусціна была цалкам сумяшчальная з чалавечай свабодай, і зблізіць яе з гуманістычным вучэннем аб маральнай свабодзе чалавека і яго індывідуальнай адказнасцю за свае паводзіны (С. Будны, Я. Даманеўскі і інш.). Асобныя ж мысліцелі абгрунтоўвалі канцэпцыю абсалютнай маральнай свабоды чалавека (Л. Зізаній і інш.). Увогуле мысліцелі Беларусі імкнуліся да ўзгаднення прынцыпу свабоды з прынцыпам агульнага дабра, падкрэсліваючы прыярытэт грамадскіх інтарэсаў перад асабістымі [7, с. 148].

Актыўнае развіццё палітыка-прававой думкі ў XVI ст., аб чым сведчыць павелічэнне колькасці мысліцеляў і асветнікаў, параўнальна высокі адукацыйны ўзровень палітычнай эліты ВКЛ і інш., стварала ідэйна-тэарэтычныя падставы для рэфармавання ўсіх сфер грамадскага жыцця, у тым ліку прававой, а адпаведна — павышэння ўзроўню прававой культуры. Несумненным вынікам гэтага працэсу стала праяўленне ў грамадска-палітычным жыцці дзяржавы важнай тэндэнцыі — рэалізацыі тэарэтыка-

прававых ідэй у заканадаўстве. Тым больш што многія мысліцелі ўдзельнічалі ў працы павятовых соймікаў, сойма, уваходзілі ў склад заканадаўчых камісій. Напрыклад, Павел Астравецкі, які актыўна прапагандаваў ідэі рэфармавання грамадскіх адносін, умацавання суверэнітэту і дзяржаўнасці, быў членам камісіі па падрыхтоўцы Статута 1566 г.; Агрыпа Вацлаў — пісар, кашталян мінскі і смаленскі, які пісаў палемічныя трактаты аб свабодзе і справядлівасці, прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы Статута 1588 г. і г. д. Многія навукоўцы і мысліцелі імкнуліся аб'яднаць прававую тэорыю з практыкай, што і знайшло практычную рэалізацыю пры ўдасканаленні заканадаўства, асабліва пры стварэнні першых у Еўропе зводаў законаў, напісаных на беларускай мове, заснаваных на мясцовым праве і традыцыях народа — Статутаў 1529, 1566, 1588 гг. [6, с. 367].

Паралельна ішоў працэс удасканалення дзейнасці важнейшага заканадаўчага органа Вялікага Княства Літоўскага — сойма, які са звычайнага сходу феадалаў пераўтвараецца ў XVI ст. у саслоўна-прадстаўнічы орган шляхты з даволі шырокімі паўнамоцтвамі. У другой палове XVI ст. сойм дзейнічае ўжо як вышэйшы заканадаўчы орган дзяржавы, нарматворчая функцыя якога ўсё больш актывізуецца. У сувязі з гэтым спачатку Віленскі прывілей 1565 года, а потым Статуты 1566 і 1588 гг. сваімі нормамі ўсё больш удакладняюць дзейнасць сойма. Пры гэтым, калі спачатку толькі прадстаўнікі шляхецкага саслоўя прымалі ўдзел у працы сойма, то ў 1568 г. віленскія мяшчане дабіліся права пасылаць на сойм 2-3 бурмістраў, хоць яны і ўдзельнічалі ў абмеркаванні толькі тых пытанняў, якія тычыліся гарадоў.

Адначасова афармляецца больш дакладнае падзяленне сойма на дзве палаты (т. зв. станы, або колы): кола паноў-рады і рыцарскае (шляхецкае) кола, якія абмяркоўваюць пытанні спачатку асобна, а потым сумесна. Пры абмеркаванні законапраектаў усе дэпутаты мелі права выказаць сваю думку. Пры разыходжанні думак рабіліся спробы прымірыць бакі і ўзгадніць прапановы, што прыводзіла да замаруджвання работы сойма, які часам працаваў па некалькі месяцаў. Рашэнні прымаліся, як правіла, большасцю галасоў. Нельга не адзначыць, што даволі часта ў дзейнасці сойма праяўляўся прынцып — што вырашае вялікі князь і паны-рада, тое шляхта прымае да выканання. Аднак пры гэтым вялікі князь абавязваўся не парушаць дзеючых законаў, звычаяў, свабод, а новыя законы прымаць толькі на вальным сойме «з ведомостью и порадою рад наших и призволеньем всих станов, сойму належачых» [9, р. III, арт. 15].

Як сведчаць крыніцы, законапраектная праца засяроджвалася ў вялікакняжацкай канцылярыі, а пры падрыхтоўцы буйных законапраектаў ствараліся спецыяльныя соймавыя камісіі (асабліва пры падрыхтоўцы

Статутаў), якімі кіравалі канцлер або падканцлер дзяржавы. Заканадаўца ў гэты перыяд ужо добра ўсведамляў асноўныя юрыдычныя паняцці і карыстаўся даволі ўсталяваным юрыдычным апаратам. Пры гэтым ён звяртаў увагу на неабходнасць публічнасці і адкрытасці заканадаўчага працэсу. У самім законе гаварылася аб абавязковым абнародаванні прынятых законаў: «А для всих посполите в местех, местечках наших, на торгох и пры костелех парафеяльных обволывати и копеи з листов наших прибивати» [9, р. III, арт. 6]. Менавіта гэта ў значнай ступені садзейнічала пашырэнню прававой культуры ў грамадстве.

Такім чынам, XVI ст. унесла якасныя змены ў праватворчасць і заканадаўства, а самы дасканалы закон — Статут 1588 г., распрацаваны на падставе абагульнення папярэдняга заканадаўства і палітыка-прававой думкі, — шмат у чым апераджаў свой час. Ён утрымліваў параўнальна вялікі (488 артыкулаў) і вельмі значны прававы матэрыял, які сведчыў не толькі аб эвалюцыі ў прагрэсіўным накірунку права, прававых прынцыпаў, інстытутаў і нормаў, але і аб развіцці прававой культуры грамадства. Тым больш што афіцыйнае апублікаванне Статута ў Віленскай тыпаграфіі братоў Мамонічаў садзейнічала як паляпшэнню рэалізацыі яго нормаў, так і даступнасці закона, а тым самым — значнаму павышэнню правасвядомасці народа і прававой культуры грамадства.

---

1. Общая теория права: пособие / В. А. Абрамович [и др.] ; под общ. ред. С. Г. Дробязко, С. А. Калинина. Минск : БГУ, 2013. 416 с. Вернуться к статье

2. Алексеев С. С. Теория права. Изд. 2-е перер. и доп. М. : Изд-во БЕК, 1995. 320 с. Вернуться к статье

3. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права: Дапаможнік / Я. Юхо [і інш.]. Мінск : БДУ, 2000. 127 с. Вернуться к статье

4. Доўнар Т. І. Ефрасіння Полацкая — хрысціянскі дзяржаўны дзеяч, асветніца і мысліцель // Юстыцыя Беларусі. 2006. № 11. С. 1–2. Вернуться к статье

5. Палітычныя мысліцелі і гуманісты Беларусі / Г. С. Авакян [і інш.]. Мінск : ТАА «Элайда», 2002. 96 с. Вернуться к статье

6. Доўнар Т. І. Прававыя пытанні ў тэарэтычнай распрацоўцы беларускіх мысліцеляў XVI стагоддзя / Генетические закономерности права : сборник науч. трудов, посвященных 90-летию со дня рождения С. Г. Дробязко / ред. кол. : С. А. Балашенко (гл. ред.) [др.]. Минск : Бизнесофсет, 2013. С. 357–368. Вернуться к статье

7. Падокшын С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / пад рэд. А. С. Майхровіча. Мінск : Навука і тэхніка, 1990. 285 с. Вернуться к статье

8. Волян А. Аб грамадзянскай або палітычнай свабодзе. Пер. з лац. Ул. Шатона. Мінск : выдавец Зміцер Колас, 2009. 144 с. Вернуться к статье

9. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1989. 573 с. Вернуться к статье